**Использованные источники и литература**

1. Отчет Всероссийского Центрального Совета профессиональных союзов за 1919 год /сост. Н. Глебов. – М.,1920. – 392 с.
2. Дубовик, А. К. Первый Всебелорусский съезд профсоюзов и его историческое значение / А. К. Дубовик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2011. – № 1. – С. 4–10.
3. Профессиональные союзы Беларуси: история и современность / под ред. Л. П. Козика. – Минск: ФПБ, 2007. – 672 с.
4. История профсоюзного движения Беларуси / П.Г. Давидюк [и др.]; под ред. Л. П. Козика. – Минск: ФУАинформ, 2005. – 416 с.
5. Дубовік, А. А. Дзейнасць прафсаюзаў Беларусі па рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін у перыяд НЭПа (1921–1929 гг.): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / А.А. Дубовік; БДПУ. – Мінск, 2017. – 27 с.
6. Дубовик, А. К. Возрастание роли профсоюзных организаций в жизни колхозной деревни (по материалам Белорусской ССР) / А. К. Дубовик // Проблемы истории советского крестьянства: сб. ст. / Акад. наук СССР, Ин-т истории; редкол.: М. П. Ким [и др.]. – М.: Наука, 1981. – С. 251–261.

## З ГІСТОРЫІ ДЗЯРЖАЎНАГА РЭГУЛЯВАННЯ ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН У БССР

Дубовік А. А. г. Мінск, БНТУ

Рэгуляванне працоўных адносін мае важнае значэнне ў любой дзяржаве, паколькі праца – асноўная ўмова існавання чалавека і грамадства ў цэлым. Забеспячэнне занятасці насельніцтва выступае ключавым фактарам павышэння ўзроўню і якасці жыцця. Разам з тым гісторыя сацыяльна-працоўных адносін у савецкі перыяд з'яўляецца найменш даследаванай у беларускай гістарыяграфіі, што абумоўлівае актуальнасць і неабходнасць вывучэння дадзенай праблемы. Тым болей, што некаторыя формы і метады рэгулявання рынку працы, якія прайшлі апрабацыю ў 20-я гг. XX в., могуць быць выкарыстаны на сучасным этапе з улікам новых умоў і патрабаванняў жыцця.

Важнейшую ролю ў рэгуляванні працоўных адносін, як і іншых сфер жыцця, адыгрывае дзяржава. З устанаўленнем у краіне ў

канцы 1917 г. савецкай улады рэгуляванне занятасці насельніцтва набыло агульнадзяржаўны маштаб. Для практычнага ажыццяўлення савецкай палітыкі ў галіне працы быў створаны спецыяльны дзяржаўны орган РСФСР – Народны камісарыят працы (НКП). Да ліку яго галоўных функцый адносіліся: выданне нарматыўных актаў аб працы; высвятленне попыту ў рабочай сіле і яе ўлік; барацьба з беспрацоўем; арганізацыя дапамогі беспрацоўным. У Беларусі кіраўніцтва дзейнасцю ў працоўнай сферы да ўтварэння БССР ажыццяўляў Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзап) і яго аддзел – Камісарыят працы.

Пры ўтварэнні БССР у студзені 1919 г. быў створаны і Наркамат працы рэспублікі. Наркамам быў прызначаны Язэп Лявонавіч Дыла. Аднак у сакавіку 1919 г. у сувязі са стварэннем Літбел ССР наркамат спыніў сваю дзейнасць, перадаў функцыі аддзелу працы Мінскага губваенкама і Наркамату працы Літбел (наркам С.М. Дзіманштэйн). Аднавіў сваю дзейнасць Наркамат працы БССР у ліпені 1920 г. пасля другога абвяшчэння БССР. Пасаду наркама працы займалі вядомыя дзяржаўныя дзеячы: Я.Б. Генкін (1920–1921 гг.), Б.Э. Аршанскі (1921 г.), М.Е. Міленькі (1922 г.), В.А. Нодэль (1922–1923 гг.), С.С. Ерафееў (1924–1926 гг.), А.С. Славінскі (студзень – сакавік 1927 г.), К.Ф. Бенек (красавік 1927 – красавік 1929 г.), М.П. Гнілякевіч (май 1929 – люты 1931 г.), А.Е. Баскін (ліпень1931–1932 гг.) [1]. Наркамат працы дзейнічаў у цесным кантакце з прафсаюзнымі органамі. На Усебеларускіх з'ездах прафсаюзаў заслухоўваліся справаздачы Наркамата працы БССР, зацвярджаліся наркамы. Кіраўнікі наркамата выбіраліся ў склад ЦСПСБ і яго Прэзідыума [2].

Заканчэнне грамадзянскай вайны і пераход да НЭПу супалі з прыняццем Кодэкса законаў аб працы (КЗаП) РСФСР 1922 г., дзеянне якога было распаўсюджана і на тэрыторыю БССР [3]. Важнейшай навацыяй у сферы працоўных адносін пры пераходзе да НЭПу стала ўзнікненне калектыўна-дагаворнай практыкі прафсаюзаў і наймальнікаў. У Беларусі калдагавор упершыню быў заключаны ў канцы лістапада 1921 г. паміж прафсаюзам харчавікоў і Мінскім адзіным спажывецкім таварыствам у дачыненні да хлебапякарні апошняга [4]. Адным з важнейшых шляхоў рэгулявання працоўных адносін у 1920-я гг. з'яўлялася тарыфна-эканамічная работа, рэгуляванне зарплаты [5].

Знакавым момантам пры пераходзе да новай сістэмы гаспадарання стала адмова ад палітыкі прымусовага размеркавання працоўных рэсурсаў, замена забеспячэння народнай гаспадаркі рабочай сілай у парадку працоўнай павіннасці яе вольным наймам. Усерасійскі ЦВК пастановай ад 3 сакавіка 1922 г. увёў прынцып добраахвотнасці ў справе пасылкі беспрацоўных на працу. Пададдзелы размеркавання НКП былі пераўтвораны ў біржы працы. Яны сталі вядучым дзяржаўным органам, які вырашаў пытанні працаўладкавання беспрацоўных. У 1924 г. біржы працы існавалі ў 11 гарадах БССР: Мінску, Віцебску, Магілёве, Бабруйску, Барысаве, Слуцку, Мазыры, Чэрвені, Горках, Мсціславе і Клімавічах [6, арк. 218]. Асноўным прынцыпам у рабоце бірж працы быў прымат інтарэсаў рабочых над інтарэсамі наймальнікаў; беспрацоўныя абараняліся ад самавольства прадпрымальнікаў.

За перыяд з 1922 па 1924 г. біржы працы прайшлі шлях ад манапольнага панавання на рынку працы, што аказалася нерацыянальным у новых сацыяльна-эканамічных умовах, да частковай дэманапалізацыі іх дзейнасці, звязанай з рэарганізацыяй бірж у пасрэдніцкія бюро па найме рабочай сілы згодна з пастановамі НКП СССР ад 21 жніўня 1924 г. і НКП БССР ад 30 снежня 1924 г [7]. Рэарганізацыя бірж адлюстравала прыярытэты сацыяльна-эканамічнай палітыкі савецкай дзяржавы. Уводзілася практыка самастойнага найму гаспадарчымі органамі рабочых неабходнай кваліфікацыі з наступнай рэгістрацыяй у органах пра-цы. Беспрацоўныя атрымалі права на індывідуальны пошук рабо-чага месца. Як і біржы працы, пасрэдніцкія бюро кіраваліся спе-цыяльна створанымі Камітэтамі – калегіяльнымі органамі, у склад якіх ўваходзілі прадстаўнікі ўсіх бакоў працоўных адносін (гаспа-дарчыя кіраўнікі, прафсаюзныя дзеячы, работнікі наркамата працы).

Пачынаючы з 1922 г., НКП і прафсаюзамі была распрацавана і прыменена шматпланавая сістэма барацьбы з беспрацоўем. Асноўнымі яе накірункамі з’яўляліся: натуральная і фінансавая дапамога беспрацоўным; арганізацыя грамадскіх работ; стварэнне арцелей і працоўных калектываў з беспрацоўных; прафесійнае навучанне беспрацоўных. Прадастаўленне працы грамадзянам ажыццяўлялася праз органы НКП, да 1925 г. найм адбываўся пры абавязковым пасрэдніцтве бірж працы. Прымяненне працоўнай павіннасці па арт. 11 КЗаП 1922 г. абмяжоўвалася выключнымі

выпадкамі і магло ўводзіцца спецыяльнымі пастановамі СНК. А на некаторыя катэгорыі грамадзян працоўная павіннасць увогуле перастала распаўсюджвацца (непаўналетнія, інваліды і г. д.).

З мэтай павышэння эфектыўнасці рэгулявання рынку працы Наркамат працы і прафсаюзы з сярэдзіны 20-х гг. ажыццявілі пераход ад пераважна "пасіўных" форм і метадаў барацьбы з беспрацоўем (рэгістрацыі на біржы працы; выплаты матэрыяльнай дапамогі; скарачэння звышурочнай працы; браніравання рабочых месц для падлеткаў) да "актыўных": стварэння працоўных калектываў з беспрацоўных; арганізацыі грамадскіх работ; прафесійнага навучання моладзі; перакваліфікацыі беспрацоўных. Павялічваліся асігнаванні па дзяржаўным і мясцовым бюджэтах на барацьбу з беспрацоўем. Большасць усіх сродкаў ішла на арганізацыю грамадскіх работ і працкалектываў [2].

Арганізоўвалася навучанне беспрацоўных падлеткаў на курсах Цэнтральнага інстытута працы (ЦІП), аддзяленне якога было адкрыта ў Мінску згодна з пастановай Прэзідыума ЦСПСБ ад 13 мая 1926 г., і іншых формах прафесійнага навучання. На курсах ЦІПа ў 1926–1928 гг. было падрыхтавана 800 кваліфікаваных слесараў, токараў, кавалёў, будаўнікоў. У 1929–1930 гг. тут набылі будаўнічыя прафесіі 4362 беспрацоўных [8, с. 25, 28].

Ажыццяўленне ў другой палове 20-х гг. індустрыялізацыі не дазволіла адразу зменшыць беспрацоўе. Яно павялічылася ў БССР з 34,7 тыс. чал. у канцы 1925 г. да 50,1 тыс. у пачатку 1928 г., што складала прыкладна 19 % ад колькасці рабочых і служачых, занятых у народнай гаспадарцы. Сярод беспрацоўных, па звестках на кастрычнік 1928 г., індустрыяльных рабочых было 26,9 %, некваліфікаваных – звыш 63 %. Такое становішча было выклікана, галоўным чынам, аграрным перанасяленнем у беларускай вёсцы [9, с. 278, 279, 314].

На рубяжы 1920–30-х гг. кіраўніцтва УсеКП (б) канчаткова адмовілася ад эканамічных механізмаў барацьбы з беспрацоўем на карысць адміністрацыйных метадаў дзяржаўнага цэнтралізаванага рэгулявання працоўных рэсурсаў. У 1930 г. Наркамат працы СССР перайшоў да планавага арганізаванага набору рабочай сілы для патрэб прамысловасці, транспарту і будаўніцтва, а біржы працы па сутнасці былі рэарганізаваны ў органы планавага размеркавання рабочай сілы з поўным спыненнем выплат дапамогі па беспрацоўі. 20 кастрычніка 1930 г. ЦК УсеКП (б) прыняў пастанову "Аб

мерапрыемствах па планавым забеспячэнні народнай гаспадаркі рабочай сілай і барацьбе з цякучасцю”, у ёй упершыню афіцыйна дэкларавалася ліквідацыя беспрацоўя ў краіне [10].

У савецкі час лічылася, што ў Беларусі, як і ў краіне ў цэлым, беспрацоўе было поўнасцю ліквідавана да пачатку 1931 г. [11, с.181]. Аўтары пятага тома “Гісторыі Беларусі” (2007 г.) адзначаюць: “Пачатак ажыццяўлення палітыкі індустрыялізацыі, пашырэнне прамысловага будаўніцтва паслужылі асновай для скарачэння беспрацоўя, якое ў асноўным было пераадолена ў канцы 1931 г.” [12, с. 171].

Пастановай ЦВК і СНК БССР ад 27 ліпеня 1929 г. КЗаП 1922 г. быў выкладзены ў новай рэдакцыі [11]. У яго былі ўнесены змяненні і называўся заканадаўчы акт ужо Кодэксам аб працы БССР. З пэўнай доляй умоўнасці можна лічыць Кодэкс 1929 г. першым уласным працоўным кодэксам рэспублікі. Але, хоць у Кодэксе 1929 г. некалькі змянілася нумерацыя артыкулаў і найменаванне бакоў працоўнага дагавора (замест наёмных працаўнікоў – рабочыя і служачыя; тэрмін “наймальнік” у асобных артыкулах заменены словам “адміністрацыя”), канцэптуальных змяненняў у рэгуляванні працоўных і звязаных з імі адносін не адбылося [13, с. 153].

У верасні 1933 г. Наркаматы працы СССР і БССР былі ліквідаваны, а некаторыя іх функцыі ў сферы сацыяльна-працоўных адносін перададзены прафсаюзам [14], якія тым самым фактычна ператварыліся ў дзяржаўную структуру. У лістападзе 1933 г. была створана пастаянная Камісія па рэгуляванні вярбоўкі рабочай сілы пры СНК БССР, у жніўні 1938 г. — Камісія па арганізаваным наборы рабочай сілы пры СНК БССР.

Ва ўмовах функцыянавання ў краіне камандна-адміністрацыйнай сістэмы не існавала рэальнага рынку працы, меліся толькі яго асобныя элементы. Адносіны найму рабочай сілы насілі пераважна фармальны характар: работнікам гарантавалася рабочае месца, абмяжоўвалася свабода прапановы рабочай сілы, яе мабільнасць. Аднавіўся інстытут працоўнай павіннасці, на працягу шэрагу гадоў прымяняліся масавыя формы прымусовай працы.

У 1930-я гг. узмацнілася ўмяшанне дзяржавы не толькі ў рэгуляванне ўласна працоўных адносін (наёмнай працы), але і ў сферу працы іншых катэгорый насельніцтва, у прыватнасці сялян. Гэта было звязана з паскораным правядзеннем калектывізацыі на мяжы 20–

30-х гг. Паколькі сяляне без ахвоты ўступалі ў калгасы, а затым пачалі выходзіць з іх, улада прыняла крокі для пазаэканамічнага абмежавання свабоды калгаснікаў пакідаць арцелі. Па Інструкцыі СНК СССР 1933 г. паспартызацыя на калгаснікаў не распаўсюджвалася. Гэта істотна абмяжоўвала права членаў калгаса на працу. Калгаснік не мог па сваёй ініцыятыве не толькі перавесціся на іншае прадпрыемства, але і звольніцца па ўласным жаданні і ўладка-вацца на новую працу, паколькі прыём на працу без пашпарта быў забаронены [15, с. 153–154]. Склалася сістэма пазаэканамічнага прымацавання сялян да калгасаў, якая праіснавала да канца 1950-х гг., калі пачалася паступовая паспартызацыя сельскага насельніцтва.

У першыя пасляваенныя гады кіраўніцтвам арганізаваным наборам рабочай сілы і працаўладкаваннем насельніцтва займалася Міністэрства працоўных рэсурсаў СССР, створанае згодна з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета ад 15 мая 1946 г. [16, с. 25]. З яго ўдзелам вырашаліся і пытанні працаўладкавання насельніцтва, якое вярталася з эвакуацыі. Яшчэ ў лютым 1944 г. было створана Бюро па ўліку і размеркаванні рабочай сілы пры СНК БССР, у 1946 г. яго функцыі перададзены Упраўленню працоўных рэзерваў. На базе аддзела арганізаванага набору рабочых Беларускага упраўлення працоўных рэзерваў было створана Упраўленне арганізаванага набору рабочых пры Савеце Міністраў БССР. 31 снежня 1954 г. яго аб’яднaлі з Упраўленнем перасялення Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР у Галоўнае ўпраўленне па перасяленні і арганізаваным наборы рабочых пры Савеце Міністраў БССР. З 1947 г. функцыянавалі аддзелы па выкарыстанні працоўных рэсурсаў аблвыканкамаў, якія ў 1962 г. былі пераўтвораны ў аддзелы па перасяленні і аргнаборы рабочых.

У другой палове 60–70-х гг. удасканальваннем форм і метадаў рэгулявання размяшчэння рабочай сілы на тэрыторыі краіны займаліся дзяржаўныя камітэты Саветаў Міністраў саюзных рэспублік па выкарыстанні працоўных рэсурсаў і аналагічныя аддзелы аблвыканкамаў, створаныя ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 22 снежня 1966 г. «Аб мерах па забеспячэнні далейшага росту прадукцыйнасці працы ў прамысловасці і будаўніцтве» [17]. Дзяржкамітэт Савета Міністраў БССР па выкарыстанні працоўных рэсурсаў быў створаны 28 лютага 1967 г. У 1976 г. адбылася рэарганізацыя Дзяржкампрацы СССР, які стаў саюзна-рэспубліканскім

Дзяржаўным камітэтам СССР па працы і сацыяльных пытаннях. Адначасова Дзяржкамітэт Савета Міністраў БССР па выкарыстанні працоўных рэсурсаў быў пераўтвораны ў Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па працы, у 1978 г. – у Дзяржаўны камітэт БССР па працы, в 1988 г. – у Дзяржаўны камітэт БССР па працы і сацыяльных пытаннях, 18 студзеня 1991 г. – у Дзяржаўны камітэт БССР па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва.

У 1970 г. былі прыняты Асновы заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб працы. Услед за гэтым 23 чэрвеня 1972 г. быў прыняты Вярхоўным Саветам БССР Кодэкс законаў аб працы Беларускай ССР, які ўступіў у дзеянне 1 кастрычніка 1972 г. і ўнёс пэўныя змены ў рэгуляванне працоўных і звязаных з імі адносін, у прыватнасці ў пытанні аховы працы, асаблівасцей рэгулявання працы асобных катэгорый працаўнікоў (жанчын, непаўналетніх) [18]. У 1988 г. былі ўнесены змяненні ў Асновы заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб працы, а таксама ў КЗаП БССР. У чэрвені 1999 г. быў прыняты і ўступіў у дзеянне з 1 студзеня 2000 г. Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 1994 г. № 122 Дзяржаўны камітэт па працы і сацыяльнай абароне быў пераўтвораны ў Міністэрства працы, а Міністэрства сацыяльнага забеспячэння Міністэрства – у Міністэрства сацыяльнай абароны. На сучасным этапе ў якасці суб’екта кіравання сацыяльна-працоўнай сферай у Беларусі выступае Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, створанае 24 верасня 2001 г. у выніку аб’яднання міністэрства працы і міністэрства сацыяльнай абароны.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

1. Дубовик, А. К. Народный комиссариат труда / А. К. Дубовик // Профессиональные союзы Беларуси. Энциклопедия. – Минск, 2012. – Т.2. – С.10.

2. Дубовік, А. А. Удзел прафсаюзаў БССР у рэгуляванні рынку працы: барацьба з беспрацоўем у перыяд нэпа / А. А. Дубовік // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2015. – Вып. 30. – С. 184–192.

3. Кодекс законов о труде РСФСР: утвержден IV сессией ВЦИК, 9 нояб. 1922 г. // Собр. узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьян. Правительства РСФСР. – 1922. – № 70. – Ст. 903.

4. Дубовік, А. А. Дзейнасць прафсаюзаў Беларусі па калектыўна-дагаворным рэгуляванні працоўных адносін у перыяд НЭПа / А. А. Дубовік // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2015. – № 4. – С. 36–42.

5. Дубовік, А. А. Удзел прафсаюзаў Беларусі ў рэгуляванні заработнай платы ў перыяд нэпа / А. А. Дубовік // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Вып. 33. – Мінск, 2018. – С.115–122.

6. НАРБ. – Фонд 44. Воп. 1. Спр. 979.

7. О реорганизации бирж труда в посреднические бюро по найму рабочей силы: постановление Наркомата труда БССР, 30 дек. 1924 г. // Собр. узаконений и распоряжений Рабоче-Крестьян. Правительства БССР. – 1925. – № 16. – Ст. 129.

8. Опимах, Н. А. Ликвидация безработицы в Советской Белоруссии (1917–1930 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Н. А. Опимах ; АН БССР, Ин-т истории. – Минск,1970. – 30 с.

9. Развитие экономики Белоруссии в 1928–1941 гг. / под ред. В.И. Дрица. – Минск: Наука и техника, 1975. – 317 с.

10. Правда. – 1930. – 22 окт.

11. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969 гг.). – Минск: Беларусь, 1970. – 474 с.

12. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. – 613 с.

13. Кодэкс аб працы БССР: пастанова №191 ЦВК і СНК БССР, 27 ліп. 1929 г. // Збор законаў і загадаў Рабоча-Сялян. Урада БССР.– 1929. – № 33. – С. 645–663.

14. Збор законаў і загадаў Рабоча-Сялян. Урада БССР. – 1933. – № 41. – Пастанова 260.

15.Томашевский, К. Л. История правового регулирования трудовых отношений в Беларуси / К. Л.Томашевский // Известия высших учебных заведений. Правоведение. – 2006.– № 1. – С. 143–158.

16. Сборник законов СССР и указов Президиума Верховного Совета СССР. 1945–1946. – М., 1947. – 187 с.

17. Собрание постановлений и распоряжений правительства СССР. – 1967. – № 1. – Ст. 1.

18. Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. – 1972. – № 18. – Арт. 266.